ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982

9

СНЕЖНЯ

ЧАЦВЕР

№ 36 (1374)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ПРАФКОМ

універсітэта на чарговым пасяджэнні абмеркаваў задачы палітыка - выхаваўчай і культурна - масавай работы ў інтэрнатах. Л. Вашкевіч, член КВК, адзначыла добры ўзровень мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў інтэрнатах №№ 2, 4, 6, пакрытыкавала работу культурна - масавых камісій студсаветаў у інтэрнатах №№ 5, 7.

Р. МАРЧУК,
член прэс-цэнтра прафкома.

КУБІНСКАЕ ЗЯМЛЯЦТВА

горада Мінска правяло ў актавай зале БДУ імя У. І. Леніна справаздачна - выбарны сход, на якім прысутнічаў першы сакратар прадстаўніцтва Міністэрства вышэйшай адукацыі Кубы ў СССР — Ангэль Вэга.

Са справаздачным дакладам выступіла прэзідэнт зямляцтва Эварына Дэулафэа — студэнтка аддзялення філасофіі БДУ. У дакладзе дадзены аналіз работы арганізацыі за справаздачны перыяд, паспяховасці студэнтаў, ідэйна - палітычнай работы, маральнага выхавання, самадзейнасці, спорту. У абмеркаванні дакладу актыўна ўдзельнічалі студэнты, якія прааналізавалі асноўныя праблемы і недахопы, унеслі прапановы.

На сходзе быў абраны новы савет зямляцтва. Чатыры з пяці членаў савета — студэнты БДУ імя У. І. Леніна.

Заключнае слова сказаў таварыш А. Вэга, ён падвёў агульныя вынікі, закрануў актуальныя пытанні міжнароднага і ўнутранага становішча Кубы. Сход яшчэ раз пацвердзіў: Савецкая краіна аказвае вялікую дапамогу сацыялістычнай Кубе ў падрыхтоўцы высококваліфікаваных спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі.

ХАСЭ АЛЬВАРЭС,
студэнт гістфака, слухач аддзялення журналістыкі ФГП.

НОВЫ ПРАФІЛАКТОРЫЙ

для студэнтаў універсітэта павінен адкрыцца пасля новага года ў інтэрнаце № 8. Цяпер там вядуцца работы па добраўпарадкаванню, актыўны ўдзел у якіх прымаюць студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі. Яны арганізавалі некалькі суботнікаў, на якіх асабліва добра працавалі першакурснікі. Сярод іх вызначыліся С. Амосаў і С. Прахарэнка.

П. БАБКОЎ,
член прэс-цэнтра прафкома.

Упэўненым крокам

З УРАЧЫСТАГА ВЕЧАРА КАЛЕКТЫВУ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ПРЫСВЕЧАНАГА 60-Й ГАДАВІНЕ З ДНЯ ЎТВАРЭННЯ СССР

У гэтыя снежаньскія дні працоўныя калектывы адзначаюць слаўны юбілей у гісторыі нашай краіны — 60-годдзе ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Гэтай падзеі быў прысвечаны ўрачысты вечар калектыву Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

ГУЧЫЦЬ ГІМН Савецкага Саюза і Гімн Беларускай ССР. Пачынаецца ўрачыстая частка вечара. Загадчыца кафедры беларускай літаратуры В. В. Казлова прапануе выбраць ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК КПСС.

Слова для даклада прадастаўляецца намесніку сакратара парткома універсітэта па ідэалагічнай рабоце Пятру Іванавічу **Брыгадзіну:**

— З вялікімі поспехамі падышоў калектыў БДУ імя У. І. Леніна да 60-й гадавіны з дня ўтварэння СССР. План выпуску спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры выкананы. Эканамічны эфект ад укаранення вынікаў навуковых даследаванняў складзе 18 млн. рублёў. 130 аўтарскіх пасведчанняў атрымалі за два гады пяцігодкі супрацоўнікі Белдзяржуніверсітэта абаранілі больш за 80 кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Некаторыя спецыялісты ўдастоены Дзяржаўных прэмій у галіне навукі і тэхнікі, прэмій Ленінскага камсамола Беларусі. У гэтым годзе падрыхтавана і выдадзена больш за 170 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў.

Вялікі ўклад уносіць калектыў універсітэта ў выкананне Харчовай праграмы: вядуцца даследаванні па 14 тэмах. Універсітэт аказаў вялікую дапамогу калгасам і саўгасам нашай рэспублікі. Студэнцкія будаўнічыя атрады ўзвялі 43 сельскагаспадарчыя аб'екты, адпрацавалі 120 тысяч чалавекадзён у гаспадарках Мінскай і Магілёўскай абласцей.

Значны ўклад БДУ імя У. І. Леніна і ў падрыхтоўку высококваліфікаваных спецыялістаў для братніх саюзных рэспублік, сацыялістычных краін і краін, якія развіваюцца. Больш за 5 тыс. студэнтаў амаль са 100 замежных краін вучыліся ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна.

Звыш 3 тыс. выкладчыкаў-грамадазнаўцаў з 495 ВНУ краіны прайшлі перападрыхтоўку ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі пры БДУ, больш за 2 тыс. выкладчыкаў — на факультэце павышэння кваліфікацыі.

У юбілейным годзе зладжана і эфектыўна працуюць калектывы СКТБ з доследнай вытворчасцю (дырэктар М. І. Акімаў, сакратар партбюро А. Г. Калтыгін, старшыня прафбюро Г. М. Пармон, сакратар камсамольскай арганізацыі А. У. Ганчароў), выдавецтва БДУ (У. К. Касько, С. І. Хадасевіч, В. Р. Рудзь, А. Г. Бягун). Гэтыя калектывы ідуць у радах правафланговых сацыялістычнага спаборніцтва ў групе прадпрыемстваў свайго профілю ў сістэме Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР.

Высокіх паказчыкаў дабіліся калектывы ФПМ (В. І. Карзюк, М. М. Федзяня, Ч. М. Роліч, А. М. Сатолін), фізічнага факультэта (Э. М. Шпілеўскі, Л. М. Баркоўскі, М. У. Комар, А. А. Карэнька), гістарычнага факультэта (І. В. Царук, У. Ф. Беркаў, І. У. Каменская, Т. Л. Грыбко), калектыў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі (А. Ф. Чарняўскі, А. У. Шыдлоўскі, Б. П. Усцінаў, А. У. Цыкуноў).

За поспехамі і дасягненнямі універсітэта — напружаная праца большасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў, рабочых і служачых. Сярод іх і ветэраны універсітэта: І. Р. Некрашэвіч, П. Р. Пятровіч, М. П. Баранава, І. Р. Цішчанка, М. А. Ельяшэвіч, Я. А. Піскуноў, Р. М. Трухноў, П. П. Шуба, А. Р. Мядзведзеў, І. А. Прусаў і іншыя.

Сёння мы з гонарам называем імёны правафланговых сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар 60-годдзя ўтварэння СССР — прафесараў А. Я. Супруна, Л. М. Шнеерсона, І. К. Лапаціна, дацэнтаў В. С. Аношкі, М. І. Юрчука, загадчыка аддзела НДЧ В. Ф. Міхалевіча, начальніка вучэбна-вытворчых майстэрань М. І. Юзафовіча, студэнтаў — Вікторыі Каўхута, Ірыны Кулаковай, Уладзіміра Гафановіча, Святланы Канаш.

Упэўнены ў сваіх сілах, поўны аптымізму, працоўнага энтузіязму, калектыў БДУ імя У. І. Леніна і далей будзе крочыць па ленінскаму шляху, рабіць усё, каб флагман вышэйшай школы рэспублікі заўсёды быў у ліку лепшых навучальных устаноў краіны.

...Урачысты вечар, прысвечаны 60-годдзю з дня ўтварэння СССР, закончыўся канцэртам мастацкай самадзейнасці, у якім прынялі ўдзел народны ансамбль танца «Крыжачок», хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, дзіцячы танцавальны ансамбль. Доўга апладзіравалі гледачы прызёрам Рэспубліканскага конкурсу бальнага танца супрацоўнікам БДУ А. Бялovай і В. Ляшэнка, лаўрэату Рэспубліканскага конкурсу палітычнай песні і V Інтэрнацыянальнага студэнцкага фестывалю ў Маскве, выкладчыку А. Аць'ману, іншым самадзейным артыстам і калектывам.



ІНТЭРВ'Ю Ў ПЕРАПЫНКУ

Спецыяльнае канструктарска-тэхналагічнае бюро з доследнай вытворчасцю — у ліку правафланговых сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар 60-годдзя ўтварэння СССР. У перапынку я папрасіла яго дырэктара Мікалая Іванавіча АКІМАВА расказаць аб тым, з якімі вынікамі падышоў калектыў СКТБ з доследнай вытворчасцю да 60-годдзя ўтварэння СССР, падзяліцца планамі на будучае.

Вось што ён паведаміў:

— Фактычна ўся сучасная вытворчасць, хоць і апасродкавана, грунтуецца на вынiках навуковых даследаванняў і распрацовак. Доследна-канструктарскія работы адыгрываюць асаблівую ролю ў ланцугу «навука — вытворчасць». У ходзе іх ідэя вучоных упершыню атрымлівае ўвасабленне ў метале. І чым больш старанна папрацуюць канструктары, тым менш часу і сродкаў спатрэбіцца затраціць для асваення навінак у практыцы.

Наша Спецыяльнае канструктарска-тэхналагічнае бюро з доследнай вытворчасцю было арганізавана зусім нядаўна. Але сёння ўжо можна адзначыць шэраг дасягненняў маладой арганізацыі. Створаны унікальныя прылады для спектраскапіі, праходзіць прамысловую праверку абсталяванне для вытворчасці перспектыўнага цеплаізаляцыйнага матэрыялу з адходаў хімічных вытворчасцей, па вартасці ацэнены міні-ЭВМ «Нёман», прылады для медыка-біялагічных абследаванняў, апаратура вібраакустычнай дыягностыкі і г. д.

Вырас навукова-тэхнічны патэнцыял калектыву. У нас ёсць вынаходствы ў розных галінах народнай гаспадаркі, сярэдні цыкл распрацоўкі вырабаў — 1,3 года.

Калектыў СКТБ з доследнай вытворчасцю шырока разгарнуў сацыялістычнае спаборніцтва за далейшае павышэнне эфектыўнасці і якасці доследна-канструктарскіх распрацовак і выраbу вопытных узораў.

На аснове далейшага ўкаранення тэмпаў навукова-тэхнічнага прагрэсу, найбольш поўнага выкарыстання матэрыяльных, фінансавых і працоўных рэсурсаў, павышэння эфектыўнасці і якасці працы павялічаны аб'ём канструктарска - тэхналагічных работ за 9 месяцаў гэтага года на 1,7 тыс. рублёў. Павелічэнне аб'ёму работ забяспечана за кошт росту прадукцыйнасці працы. Эканамічны эфект ад укаранення новай тэхнікі і тэхналогіі склаў 1,8 млн. рублёў, атрымана 20 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы, пададзена больш за 10 рацыяналізатарскіх прапаноў. Гадавы план па аб'ёму мяркуем выканаць датэрмінова — да 27 снежня.

Цяпер жыццё ставіць перад намі новыя, больш складаныя задачы. Неабходна, каб дасягненні навукі хутка ўкараняліся не толькі ў асобных, няхай самый бліскучых, эксперыментальных і выставачных узорах, але і ў тысячах новых відаў прадукцыі. Мы і далей будзем рабіць усё магчымае для выканання гэтай важнейшай задачы.

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

Нас аб'яднала Леніна імя

Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна — буйнейшы цэнтр навукі, культуры і асветы— па праву лічыцца флагманам вышэйшай школы Савецкай Беларусі. Пастанова аб адкрыцці універсітэта была прынята ЦВК Саветаў рэспублікі 25 лютага 1919 года. У Маскве і Мінску былі створаны камісіі садзейнічання адкрыццю універсітэта. У састаў камісій увайшлі вядомыя вучоныя і дзяржаўныя дзеячы.

Адкрыццё першага ў гісторыі беларускага народа універсітэта зноў прадэманстравала мудрасць ленінскай нацыянальнай палітыкі, якую Камуністычная партыя і Савецкая дзяржава няўхільна ажыццяўлялі і ажыццяўляюць на ўсіх этапах будаўніцтва новага грамадства.

Расійская Акадэмія навук, Цэнтральная кніжная палата, Маскоўскі, Петраградскі і Кіеўскі універсітэты перадалі Беларускаму універсітэту вялікую колькасць вучэбнай і навуковай літаратуры.

У суровыя і цяжкія часіны вайны, калі Беларусь яшчэ была акупіравана ворагам, Камуністычная партыя і Савецкі ўрад праявілі выключныя клопаты аб далейшым развіцці беларускай нацыянальнай культуры. 15 мая 1943 года Савет Народных Камісараў прыняў пастанову аб аднаўленні работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У кастрычніку 1943 года на станцыі Сходня, паблізу Масквы, пачаліся рэгулярныя вучэбныя заняткі. Філалагічны, гістарычны, біялагічны, геаграфічны, фізіка-матэматычны і хімічны факультэты прынялі ў свае аўдыторыі каля трохсот апаленых вайной студэнтаў.

Неацэнную дапамогу ў адраджэнні універсітэта аказалі партыйныя і савецкія органы Масквы, вышэйшыя навучальныя ўстановы сталіцы. Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М. В. Ламаносава і маскоўскія педагагічныя інстытуты перадалі універсітэту звыш 18 тысяч кніг, дапамаглі абсталяваць вучэбныя і навуковыя лабараторыі.

Трыццацігоддзе з дня ўтварэння БССР і стварэння Кампартыі Беларусі калектыў універсітэта сустрэў у абстаноўцы вялікага палітычнага і працоўнага ўздыму. У азнаменаванне гэтай слаўнай даты ў студзені 1949 года універсітэту было прысвоена імя Уладзіміра Ільіча Леніна.

«Як добра, што мы разам...»

УНІВЕРСІТЭТ ГАСЦІННА РАСЧЫНІЎ СВАЕ ДЗВЕРЫ ПЕРАД ЮНАКАМІ І ДЗЯЎЧАТАМІ З РОЗНЫХ КУТКОЎ КРАІНЫ. НЕАДНОЛЬКАВЫЯ ШЛЯХІ ПРЫВЯЛІ ІХ СЮДЫ, АЛЕ МЭТА АДНА: НАБЫЦЬ ТРЫВАЛЫЯ ВЕДЫ І ПРАФЕСІЙНЫЯ НАВЫКІ, ПАСПРАБАВАЦЬ СІЛЫ У ТВОРЧЫМ ПОШУКУ. У ДРУЖНАЙ СЯМ'І ФІЛФАКА ВУЧАЦЦА ПЕРШАКУРСНІЦЫ ІНА РУДНІК, МАНАНА ЦЫХЕЛАШВІЛІ, ДРУГАКУРСНІК АЛЯКСАНДР БЕЛЬСКІ. ЯНЫ І СТАЛІ ЎДЗЕЛЬНІКАМІ РАЗМОВЫ.

— Адкуль вы прыехалі?

М. ЦЫХЕЛАШВІЛІ: з Грузіі. Мой родны горад Дманісі сцяной акружаюць горы, упіраюцца вяршынямі ў блакіт. Прыгажосць такая — вачэй не адвядзеш.

А. БЕЛЬСКІ: я з вёскі Цімкавічы Капыльскага раёна. Дарэчы, тут нарадзіўся Кузьма Чорны, а многія выпускнікі Цімкавіцкай школы сталі вядомымі вучонымі, грамадскімі дзеячамі.

І. РУДНІК: пра ўкраінскі горад Дубровіца мала хто чуў. На карце ён адзначаны зусім маленькай кропкай. Нічым асаблівым не вызначыўся. Хіба — сваёй гасціннасцю і шчырасцю.

— А якія адносіны складваюцца ў групе, дзе вучацца студэнты розных нацыянальнасцей? Напэўна, ёсць нейкія цяжкасці?

М. ЦЫХЕЛАШВІЛІ: ды ніякіх цяжкасцей. Здружылася пятая група яшчэ на «бульбе». Калі ў каго што не ладзіцца, кожны гатовы быў працягнуць руку дапамогі. Ні ў якім разе не адчуваеш сябе ў адзіноце. Ды і часу на сум не хапае. Мяне абралі камсоргам, клопату прыбавілася.

І. РУДНІК: словам, у нас група—нумар пяць, справы таксама на «5». Хоць у кожнага розныя інтарэсы, характары, а я ўжо і не ведаю, як можна жыць асобна ад нашага дружнага калектыву, дзе ўсе мы, прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, — адна сям'я.

А. БЕЛЬСКІ: у нашай групе — адны беларусы. За год вучобы ў мяне склаліся пэўныя ўяўленні аб жыцці філфака. Зразумела, тым, хто прыехаў да нас вучыцца з іншых саюзных рэспублік, цяжка спачатку: незнаёмыя мясціны, мова, далёка ад дому. Але не бачыў, каб хто-небудзь доўга сумаваў ці замыкаўся ў сабе. Сябры заўжды прыходзяць на дапамогу.

— Напэўна, кожны дзень вучобы прыносіць вам нешта новае?

М. ЦЫХЕЛАШВІЛІ: ёсць у нас такі прадмет — вусная народная творчасць. Вось тут сапраўды даведваешся столькі новага і незнаёмага. На наступных занятках кожны павінен расказаць аб нацыянальных вясельных абрадах. Я раскажу аб грузінскім вяселлі, на якім стала традыцыяй дарыць маладым самы дарагі падарунак — кнігу Ш. Руставелі «Віцязь у тыгровай шкуры». Гэта кніга суправаджае чалавека ўсё жыццё. І на занятках мы чыталі ўрыўкі з паэмы на грузінскай і рускай мовах...

І. РУДНІК: праз гэта новае, аб чым раней і не чула, па-іншаму пачынаеш глядзець на дзяўчат-грузінак, якія вучаць мяне народным песням, сваім традыцыям. У інтэрнаце жыву разам з полькамі, спрабую размаўляць на іх мове. Мне заўсёды хацелася ведаць як мага больш замежных слоў, прыказак, песень.

А. БЕЛЬСКІ: мы вучымся мове і традыцыям іншых народаў, але не павінны забываць аб сваіх. Зразумеў гэта ў час фальклорнай практыкі, калі запісалі мноства невядомых песень і выразаў...

— Прайшлі працоўнае лета, «бульба», два месяцы вучобы. Напэўна, ёсць што ўспомніць, падзяліцца ўражаннямі.

А. БЕЛЬСКІ: я займаюся на другім курсе, за плячыма сесіі, будатрад, фальклорная практыка. Тое, што бачыў, адчуў, паспрабаваў зрабіць сваімі рукамі, знайшло сваё месца ў вершаваных радках. Прызнаюся: пішу вершы.

І. РУДНІК: нават за кароткі час вучобы ўбачыла, якія роднасныя нашы мовы: украінская і беларуская. Ведала гэта і раней, але сама адчула гэта ўпершыню. Такія беларускія словы, як вочы, няхай, чароўны, гучаць аднолькава на абедзвюх мовах.

М. ЦЫХЕЛАШВІЛІ: а я зразумела, як добра, што ўсе мы — грузіны, украінцы, беларусы, рускія — вучымся, працуем і жывём разам

Запісала Л. ФІЛІМОНАВА.

ПЛЁННАСЦЬ НЕСПАКОЮ



Сёння на пытанні нашага карэспандэнта Н. НАДЗЕЖДЗІНАЙ адказвае доктар філалагічных навук, прафесар кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, вядомы кінакрытык Ефрасіння Леанідаўна БОНДАРАВА. Яна нарадзілася ў знамянальны год утварэння Савецкага Саюза і зараз разам з дзяржавай адзначае свой юбілей.

— Кажуць, што самае складанае ў жыцці — час выбару прафесіі. Якія цяжкасці сустрэлі Вас на гэтым шляху, як наогул адбыўся гэты выбар!

— Паколькі Вы звярнуліся да мяне з просьбай адказаць на некаторыя пытанні напярэдадні важнай для ўсіх даты—60-годдзя нашай краіны, адзначу, што мая біяграфія — звычайная для савецкіх людзей: рэвалюцыя, сацыялізм стварылі рэальныя ўмовы для вучобы, праяўлення здольнасцей, для працы, якая табе па душы. Не магу сказаць, што яшчэ са свайго вясковага дзяцінства марыла пра тое, чым зараз займаюся. Хаця, напэўна, мела значэнне тое, што ў школьныя гады з задавальненнем вучылася, захаплялася літаратурай, пісала з натхненнем сачыненні, заметкі ў насценгазету. І так здарылася, што ўжо дзевяцікласніцай стала, як кажуць, сваім чалавекам у рэдакцыі газеты «Ленінскі шлях» Лёзненскага раёна Віцебшчыны. Ці быў гэта выбар прафесіі? Наўрад. Хутчэй, юнацкае захапленне. Іншая справа, калі ў кастрычніку 1943 года я па накіраванню райкома камсамола прыйшла ў тую ж газету і адразу стала працаваць адказным сакратаром рэдакцыі. Было цяжка, але і цікава. З «раёнкі» я ўжо, можна сказаць, зусім свядома, у 1945 годзе трапіла на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна.

— Што аказалася больш складаным: знайсці прафесію для сябе ці сябе ў прафесіі!

— Студэнцкія гады майго пакалення выпадаюць на цяжкі пасляваенны час. Апрача вучобы, даводзілася зарабляць на хлеб, працаваць у рэдакцыях газет, на рэспубліканскім радыё. А дзесьці ў глыбіні душы таілася жаданне трапіць у кіно. Можа, да гэтага штурхалі яркія ўражанні ад фільмаў: «Чапаеў», «Мы з Кранштата», «Дэпутат Балтыкі»; фільмы пра Леніна, бальшавіка Максіма і іншыя, што «заселі» ў свядомасці яшчэ з дзяцінства... А хутчэй — памяць аб старэйшым браце, які быў студэнтам Ленінградскага інстытута кінаінжынераў і загінуў у час блакады. Так я, будучы студэнткай, стала працаваць рэдактарам Міністэрства кінематаграфіі, а пасля — галоўным рэдактарам па вытворчасці фільмаў Міністэрства культуры БССР. Пасады гэтыя былі больш цікавыя тым, што далучалі да любімага мастацтва: яны прымушалі да самаадукацыі, пазнання цікавага свету кіно, яго творцаў, заканамернасцей развіцця. Без гэтага я не змагла б займацца кінакрытыкай і кіназнаўствам.

Дагэтуль памятаю, з якім хваляваннем несла ў рэдакцыю першую кінарэцэнзію. Гэта былі, як я зараз разумею, не такія ўжо глыбокія разважанні аб першым пасля вайны значным творы беларускага кіно — фільме «Канстанцін Заслонаў». Але яны з'явіліся вынікам шчырага жадання падзяліцца з чытачом радасцю ад сустрэчы з яркімі вобразамі народнага героя яго баявых паплечнікаў. Раней даводзілася пісаць заметкі, карэспандэнцыі, інтэрв'ю, справаздачы. А тут зразумела: сэрца хіліцца да таго, што адбываецца ў кіно. Так і стала яно для мяне адзінай сферай даследавання. І не шкадую, бо гэта мастацтва настолькі універсальнае, што закранае ўсе аспекты жыцця. Ці чытаеш лекцыю пра кінамастацтва, ці пішаш пра яго творы і творцаў—думаеш пра тое, што адбываецца навокал і як яно асэнсоўваецца важнейшым, па вызначэнню У. І. Леніна, з мастацтваў.

Як выкладчыку факультэта журналістыкі мне даводзіцца чытаць лекцыі і весці практычныя заняткі па курсах: літаратурна-мастацкая крытыка, праблематыка і жанры газетных выступленняў па мастацтву, актуальныя пытанні публіцыстыкі. Яны патрабуюць даволі шырокай арыентацыі, адчування пульсу творчага працэсу. Гэта няпроста і ў той жа час добра, бо не дае магчымасці абмяжоўвацца «начытаным». І яшчэ мяне вабіць у такім профілі педагагічнай дзейнасці магчымасць далучаць моладзь да мастацтва, без адчування якога, на мой погляд, не можа быць цікавай асобы, а значыць, і журналіста. Кожны выпускнік універсітэта павінен фарміравацца не толькі як пэўны спецыяліст, але і як духоўна багатая асоба. А мастацтва, у прыватнасці кіно, тут можа зрабіць вельмі многае. Шкада, што гэта яшчэ недастаткова ўлічваецца ў вучэбных планах факультэтаў.

— Адкрыты характар падарыў Вам мноства сяброў-аднадумцаў, «вярбуе» і новых з ліку Вашых вучняў. Хто з іх асабліва дарагі! Пра якія сустрэчы, размовы з імі хацелася б успомніць, якія творчыя дасягненні адзначыць!

— Характар — гэта паняцце неадназначнае. А вось, што ў справе, якой я займаюся, патрэбна захопленасць, вера ў тое, што яна цікавая і прыносіць карысць — гэта вельмі важна. І яшчэ: з моладдзю працаваць нельга без шчырасці, душэўнай адкрытасці. Мабыць, тут і ёсць тое поле прыцягнення, на якім я знаходжу, як Вы кажаце, мноства сяброў і аднадумцаў з ліку маіх вучняў. Я магу ганарыцца тым, што маю паслядоўнікаў у крытыцы і мастацтвазнаўстве. Яны ёсць у нас на факультэце (гэта

Пераклічка факультэтаў

На дастойную сустрэчу юбілею Радзімы накіраваны сёння справы камсамольцаў універсітэта. Наш няштатны карэспандэнт І. АНІКЕВІЧ сустрэлася з сакратарамі камсамольскіх арганізацый факультэтаў і папрасіла расказаць аб мерапрыемствах, прысвечаных 60-годдзю з дня ўтварэння СССР.

Вольга ЖУК, сакратар камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта:

— Напярэдадні свята на кожным факультэце пройдзе пятнаццацідзённа, планы якой складаюцца ўжо цяпер. На нашым факультэце кожны паток будзе прадстаўляць адну з саюзных рэспублік. Вялікую ўвагу камітэт камсамола ўдзяляе наглядна-агітацыі. У залежнасці ад таго, дні якой рэспублікі праходзяць на ВДНГ СССР, абнаўляюцца стэнды. Студэнты факультэта сталі ўдзельнікамі «зорнага паходу» па Барысаўскаму раёну, сустракаліся з вядомымі людзьмі, выступалі з лекцыямі і канцэртамі перад вучнямі мясцовых школ.

Тамара ГРЫБКО, сакратар камітэта камсамола гістарычнага факультэта:

— Восьмага снежня на гістарычным факультэце адкрылася вахта ў гонар 60-годдзя СССР. На факультэце пройдуць грамадска-палітычныя чытанні, конкурсы газет, спартыўныя спаборніцтвы паміж курсамі, сустрэчы з замежнымі студэнтамі. А 28 снежня адбудзецца святочны вечар, у якім прымуць удзел студэнты і выкладчыкі.

Міхаіл МІХАЛАП, сакратар камітэта камсамола юрыдычнага факультэта:

— У нас на факультэце займаюцца азербайджанцы. Яны раскажуць студэнтам пра сваю рэспубліку. Факультэцкая агітбрыгада плануе выступіць з канцэртам перад будаўнікамі метро.

Лёдзій ЛЫСЁНАК, сакратар камітэта камсамола геаграфічнага факультэта:

— Праведзены «зорныя паходы» па месцах рэвалюцыйнай і баявой славы беларускага народа. Цікавай і знамянальнай была сустрэча з выкладчыкам кафедры эканамічнай геаграфіі СССР Л. А. Паўловіч, якая падзялілася ўражаннямі аб тых рэспубліках, у якіх ёй давялося пабываць. Цяпер мы праводзім суботнікі на розных аб'ектах горада. 24 снежня — факультэцкая вахта ў гонар Туркменскай ССР.

МЫ - САВЕЦКІЯ!

Яго шчаслівы лёс

НЯДАЎНА Міхаіл Ігнатавіч Дзямчук, старшы навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела сродкаў аўтаматызацыі навуковых даследаванняў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі абараніў доктарскую дысертацыю. А яму ўсяго трыццаць шэсць гадоў...

Так, ён зрабіў шмат. І пабываў ужо ва ўсіх кутках нашай краіны. У студэнцкія гады—байцом СБА у Казахстане, на Далёкім Усходзе і Каўказе. Удзельнікам агітбрыгады Мінскага абкома камсамола аб'ездзіў ударныя будоўлі Сібіры. Шкада толькі, дома, на Брэстчыне, даводзіцца бываць не часта. Рэдка выпадае ў яго свабодная хвіліна.

Зараз наш народ сустракае вялікае свята — 60-годдзе з дня ўтварэння СССР. І зрабілі нашу краіну моцнай і квітнеючай простыя савецкія людзі, такія, як Міхаіл Іванавіч Дзямчук.

Плённа працаваць на карысць Радзімы — вось яго галоўны жыццёвы прынцып. Галоўным заўсёды лічыў і лічыць тое, што чалавек павінен усё рабіць з вялікай адказнасцю, максімальна выкарыстоўваць веды, сілы, энергію, аддаваць іх людзям.

Савецкая ўлада дала М. І. Дзямчуку права вучыцца ў самай аўтарытэтнай вышэйшай навучальнай установе Беларусі, працаваць, адпачываць. Ён увесь час памятае аб гэтым. І ў школе, і ва універсітэце вучыўся толькі на выдатна, заўсёды актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. Цяпер ён — член парткома універсітэта, член многіх саветаў АН СССР і АН БССР, член камітэта маладзёжных арганізацый Беларусі. Ужо пяць гадоў чытае лекцыі студэнтам, кіруе аспірантамі і спаборнікамі на атрыманне вучонай ступені, дыпломнымі працамі студэнтаў. Ці не многа гэта для аднаго чалавека? І ці можна ўсюды паспець? Відаць, можна, як і рабіць усё з пачуццём адказнасці.

Ж. ЖМАЙЛІК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

Галіна Грэчка — Ленінскі стыпендыят. Зараз сваю выдатную вучобу і актыўную грамадскую работу яна прысвячае 60-годдзю з дня ўтварэння СССР.

НА ЗДЫМКУ: студэнтка 5 курса педагагічнага патока хімічнага факультэта Галіна Грэчка.

Фота **В. Шачака.**

Т. Д. Арлова, Н. Ц. Фральцова, Л. Ф. Шылава, А. А. Плаўнік, Л. П. Саянкова), працуюць у розных рэдакцыях і навуковых інстытутах. Многія з тых, што зараз сталі вядомымі пісьменнікамі і паэтамі, рэжысёрамі і аператарамі, даследчыкамі і крытыкамі, пачыналі з удзелу ў студэнцкіх гуртках, з навуковых прац і дыпломных работ. Калі да нас зараз прыходзяць Г. Бураўкін, А. Вярцінскі, І. Сіпакоў, А. Мальдзіс, А. Казловіч, С. Алексіевіч, я з цікавасцю іх слухаю і ўспамінаю рукапісны альманах «Творчасць журналіста», які мы разам выпускалі ў розныя гады. Не толькі я, а і студэнты, усе выкладчыкі нашага факультэта з задавальненнем сустракаюцца з былымі журфакаўцамі І. Дабралюбавым, В. Дашуком, Р. Ясінскім, М. Заслонавай, А. Алаем, У. Халіпам, якія сталі вядомымі дзеячамі кінамастацтва. Успамінаю сустрэчы і дыялогі на розных творчых канферэнцыях, пры праглядзе фільмаў. Вось адзін з такіх прыкладаў: у рэспубліцы і ў краіне пішуць і гавораць зараз пра дакументальныя фільмы з цыкла «У вайны не жаночы твар». Аўтары яго — нашы выпускнікі нарысістка Святлана Алексіевіч і кінапубліцыст Віктар Дашук. У крытыцы вядомы імёны Т. Цюрынай, М. Старых, Г. Цвятковай, С. Берасцень, Т. Мушынскай. Прыемна сустракаць іх цікавыя рэцэнзіі і грунтоўныя артыкулы ў рэспубліканскім і саюзным друку. Прыемныя сустрэчы бываюць часта, бо паўсюдна працуюць нашы выпускнікі. І калі яны людзі цікавыя, няўрымслівыя — радуюся, што мела нейкае дачыненне да іх выхавання.

— Па роду прафесіі Вам даводзіцца быць у курсе кінематаграфічнага жыцця краіны, і можа таму панарама сучаснасці паўстае перад Вамі найбольш наглядна. Як кінамастацтва адлюстроўвае 60-гадовы шлях СССР?

— Станаўленне і развіццё савецкага шматнацыянальнага кінамастацтва непарыўна звязана з гістарычным шляхам, які за шэсць дзесяцігоддзяў прайшла наша краіна. Першыя крокі Савецкай дзяржавы, першыя яе поспехі адлюстравала кінахроніка, экранная дакументалістыка. Зараз нават цяжка ўявіць сабе нашу гісторыю без кіналетапісу. У ім эмацыянальна-бачымы вобраз таго галоўнага, чым жыў савецкі народ, што перажыў, чаго дамогся. Пачынаючы з вядомых фільмаў «Браняносец «Пацёмкін», «Маці», «Кастрычнік», кінамастацтва праўдзіва адлюстроўвала і адлюстроўвае гісторыю сацыялістычнай рэвалюцыі, ролю ў ёй У. І. Леніна, Камуністычнай партыі. А колькі незабыўных падзей, фактаў, колькі герояў Вялікай Айчыннай вайны прадстаюць перад намі дзякуючы кінамастацтву! Напэўна, сярод студэнтаў няма ніводнага, хто не ведае пра герояў такіх фільмаў, як «Лёс чалавека», «Ляцяць журавы», «Балада пра салдата», «Маладая гвардыя». У гэтых стужках адлюстраваны гераізм савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

39 кінастудый Савецкай краіны ствараюць штогод 150 ігравых фільмаў для кінаэкранаў, больш за 100 — для паказу па тэлебачанні, сотні дакументальных і навукова-папулярных фільмаў пра гісторыю і сучаснасць. Зараз, як гэта адзначалася на XXVI з'ездзе КПСС, кінамастацтва больш глыбока, чым раней, даследуе тое, чым жывуць савецкія людзі, што яны пераадольваюць і да чаго імкнуцца. У гэтым кірунку прыкметны і набыткі беларускіх кінематаграфістаў, што пацвярджаюць фільмы «Час яе сыноў», «Нядзельная ноч», «Паводка», «Трэцяга не дадзена» (апошні пастаўлены былым журфакаўцам І. Дабралюбавым). На XV Усесаюзным кінафестывалі лепшым фільмам 1981 года прызнана дылогія «Людзі на балоце» — экранізацыя рэжысёрам В. Туравым аднайменнага рамана І. Мележа. На тым жа кінаспаборніцтве (а таксама на Міжнародным фестывалі ў Ляйпцыгу) прызам журы адзначаны кінанарыс «Дзевяноста шостая восень», створаны выпускнікамі БДУ В. Дашуком і А. Алаем.

Сёння кіно ў розных жанрах, тэматычных аспектах шырокаахватнай панарамай паказвае жыццё Савецкай дзяржавы. Мы часта бываем незадаволены ступенню спасціжэння жыццёвых з'яў сродкамі кіно. Але калі застаёмся сам-насам з героямі найбольш значных кінастужак, адчуваем, якое шматграннае і бурлівае наша жыццё, якія глыбокія змены адбываюцца навокал. Пра тое сёлетнія фільмы «Надзея і апора», «Крыніца», «Асабістае жыццё», «Спыніўся цягнік» і іншыя. Кінастудыя «Беларусьфільм» свята брацтва савецкіх народаў сустракае выпускам юбілейнага дакументальнага фільма «Саюз рэспублік і сэрцаў», знятага па сцэнарыю журналістаў па адукацыі А. Кудраўцава і У. Халіпы. Завершана экранізацыя другога рамана з «Палескай хронікі» І. Мележа — «Подых навальніцы». У ім Віктар Тураў і ўвесь творчы калектыў беларусьфільмаўцаў вынеслі на экран праўду глыбокіх сацыяльных пераўтварэнняў на вёсцы. З таго, што створана нашай кінастудыяй у юбілейны год, я адзначыла б яшчэ трэці фільм з тэлевізійнага цыкла «Дзяржаўная граніца». Бадай, гэта першы ў савецкім кіно такі шырокі паказ тых, хто абараняе рубяжы нашай краіны. Адным словам, фільмаў багата. Іншая справа, што не ўсе яны задаволяць патрабавальнага гледача. Асабіста для мяне — цікавыя ўсяго каля 20 карцін са 150, астатнія глядзела больш па абавязку прафесіі кінакрытыка.

— Што яшчэ вабіць Вас гэтак жа моцна, як і кіно! Ці адданасць кінематографу — той самы шчаслівы выпадак, калі захапленне стала справай жыцця?

— Так, маё захапленне супадае з той справай, якой аддадзены многія гады. Кінамастацтва, яго пазнанне і прапаганда, як і выхаванне моладзі, — вартыя таго... Але гэта зусім не значыць, што ў мяне няма іншых жаданняў. Я вельмі люблю сімфанічную і фартэп'янную музыку, тэатр. Яны дапаўняюць тое, чаго не здольны даць кінематограф — непасрэднасці кантакту з самім творчым актам... Вядома, нішто не заменіць змястоўную кнігу, якая не толькі ўзбагачае ведамі, але і жывіць думку.

— Калі б Вам давялося рэцэнзаваць уласныя працы, што б Вы ў іх адзначалі як станоўчае, а што б пакрытыкавалі!

— Самому сабе нялёгка быць суддзёй. Але, мне здаецца, я змагла б напісаць аб'ектыўную аўтарэцэнзію ці аўтаагляд. І ў іх як станоўчае адзначыла б тое, што бралася за асэнсаванне праблем, цесна звязаных з кінематаграфічнай практыкай, з творчасцю галоўных аўтараў фільмаў — сцэнарыстаў, рэжысёраў, аператараў. Пра гэта сведчаць ужо самі назвы маіх кніг: «Нарыс на экране» (сумесна з Л. Шылавай), «У кадры і за кадрам» (фільмы і людзі беларускага кіно), «Час, экран, крытыка», «Кінастужка даўжынёй у жыццё», «Кіно Савецкай Беларусі»... Амаль у кожнай са сваіх работ я знайшла б і старонкі, якія хацелася б перарабіць, напісаць лепш. Іншы раз чытаю чыйсці добры артыкул або кнігу і лаўлю сябе на думцы: вось бы мне так напісаць... Такое пачуццё не пакідала мяне, калі я пісала і новую кнігу «Экран у розных вымярэннях», якая толькі што здадзена ў выдавецтва БДУ. Супакойвае толькі адно: незадаволенасць сабой — стан, натуральны для кожнага, хто штосьці піша...

РЭЦЭНЗІЯ НА КНІГУ

ПРА ТОЕ, ШТО ДАРАГА

ЁСЦЬ СТАРОНКІ гісторыі, якія пазнаеш не адным толькі розумам, яны адгукваюцца ў табе не проста сухімі калонкамі лічбаў — адчуваюцца душой. І ёсць людзі, якіх, здаецца, ведаеш з маленства, і не толькі ведаеш, па іх, як па камертону, звяраеш, карэкціруеш уласнае жыццё. Ленін — той самы чалавек.

Сусветная Леніниана робіць вялікую справу — стварае збіральны вобраз геніяльнага мысліцеля, правадыра першай у свеце сацыялістычнай рэвалюцыі, чалавека вялікай душы. Працэс гэты несупынны, таму што тэма — невычарпальная, і чым далей адыходзяць падзеі таго гераічнага часу, тым відавочней роля і моц ленінскіх здзяйсненняў, тым больш акрэслены характар і асоба правадыра. Гэта заканамерна, бо тое, што раней, у віхуры вялікіх змен, здавалася нязначным, зараз, на адлегласці, успрымаецца як вельмі важнае і дарагое.

Яшчэ адным укладам у скарбонку твораў пра У. І. Леніна стала кніга П. І. Ткачова «Як разгаралася полымя». Жанр яе незвычайны, гэта аповесць-падарожжа. Аўтар запрашае чытача наведаць ленінскія мясціны, прайсці тымі сцежкамі, па якіх хадзіў юнак Ульянаў, калі ўпершыню зразумеў, які шлях наканаваны яму ў жыцці, пабываць там, дзе 23-гадовы марксіст вядзе заняткі рабочага гуртка, разам з Ільічом адчуць трывогу шушанскай ссылкі і радасць ад думкі: справа рухаецца.

Як вехі ўздоўж дарогі, устаўляе пісьменнік у расказ вытрымкі з дакументаў. І гэта не даніна сучаснай літаратурнай модзе на дакументалізацыю мастацкага твора, а патрабаванне жанра. У тканіну аповесці арганічна ўплятаюцца радкі з пісьмаў, афіцыйных папер, артыкулаў — усё гэта стварае непаўторную атмасферу часу. Ці не цікава прачытаць, напрыклад, такую выпіску з «Кандуітнага і кватэрнага спісу вучняў Сімбірскай гімназіі»: «УЛЬЯНАЎ УЛАДЗІМІР.

Вучань надта таленавіты, старанны і акуратны, паспяховасць па ўсіх прадметах вельмі добрая.

Паводзіць сябе прыкладна.

Сярэднія адзнакі за год па ўсіх прадметах вельмі добрыя.

Пераведзены ў VII клас».

Аўтар і чытач. Паміж імі заўсёды складваюцца свае, хай нябачныя, але трывалыя сувязі. І з кожным новым творам яны наладжваюцца зноў. Адна з асаблівасцей кнігі П. І. Ткачова — давер да чытача. Тут няма нічога падобнага на размову суровага мэтра з няўдачлівым вучнем, хутчэй,— старэйшы таварыш, шчыра зацікаўлены ў сваёй справе, дзеліцца ведамі, расказвае пра пошукі і знаходкі. З дзяцінства знаёмыя эпізоды з жыцця Ільіча прадстаюць у іншым ракурсе, іх па-асабліваму асвятляюць акцэнты, расстаўленыя аўтарам, адсюль — разумная эканомія ў выкарыстанні выразных сродкаў, строгая лаканічнасць, кампактнасць кампазіцыі. Вось як, праз успаміны тых, хто бачыў і ведаў Уладзіміра Ільіча, раскрываецца ўздзеянне і моц ленінскай думкі, яго жывога, натхняючага слова:

«...Як цяпер памятаю наш невялічкі, з адным акном, доўгі пакойчык з зялёнай канапай і двума ложкамі. На гэтай канапе за сталом сядзіць гэты новы, цікавы чалавек. Уладзіміру Ільічу тады было ўсяго 23 гады. Святло лямпы асвятляе яго вялікі, круты лоб з кольцамі рыжаватых валасоў вакол выразнай лысіны, хударлявы твар з невялічкай бародкай. Свае пярэчанні па артыкулу Германа Красіна ён чытае па сшытку.

...Уладзімір Ільіч кончыў чытаць. Пачалася гарачая спрэчка... Уладзімір Ільіч маўчыць, уважліва слухае, пераводзячы свае вострыя, насмешлівыя, дапытлівыя вочы з аднаго на другога. Нарэшце ён бярэ слова, і адразу запанавала цішыня. Усе з незвычайнай увагай слухаюць, як Уладзімір Ільіч абвяргае Г. Красіна...

Я бачыла тады Уладзіміра Ільіча першы раз у жыцці. І адразу ён прынёс з сабою нешта яркае, жывое, новае, непераможнае. Я... была проста ўзрушана гэтым вечарам. Цэлая віхура думак...».

Чытач удзячны за дадзеную яму магчымасць аналізаваць, разважаць, удзячны за пакінутую «інтэлектуальную прастору», за тое, што аўтар, пазбегнуўшы прамалінейнасці, не пабаяўся аддаць яму права на вывад. Такая ўстаноўка на самастойнасць прыводзіць да жаданых вынікаў: чытач атрымлівае ўрокі. Ленінскія. Асабліва каштоўныя ў юнацтве, калі ідзе пошук маральных арыенціраў, калі надзвычай вялікая роля прыкладу.

...«Як разгаралася полымя». Далікатна, тактоўна П. І. Ткачоў напамінае нам старонкі гісторыі, нешта тлумачыць, іншае толькі бегла акрэслівае, цярпліва збірае тыя самыя «іскрынкі» — ад студэнцкага выступлення ў Казанскім універсітэце да падрыхтоўкі ўзброенага паўстання,—якія разгарэліся ў сапраўднае, непераможнае, рэвалюцыйнае полымя.

Калі б мяне папрасілі адным эпітэтам акрэсліць усе якасці аповесці, я б сказала: «Яна сучасная». Дзякуючы дакладнай, неперагружанай мове, цікавай кампазіцыі, змястоўным і ненадакучлівым аўтарскім каментарыям, атрымаўся стрыманы па тону, але поўны ўнутранай энергіі твор. Сучасная і мэта: намаляваць вобраз самага дарагога для ўсіх нас чалавека, і не проста расказаць пра яго, а паказаць у дзеянні, у сапраўдным жыцці, у працы, якая пераўтварае свет. Задача гэта няпростая, кожны з пісьменнікаў знаходзіць для яе вырашэння свой шлях. У П. І. Ткачова ён шчаслівы, таму што дазваляе дакрануцца да вытокаў, адчуць імклівы крок часу і сказаць «дзякуй» веку за магчымасць творчага далучэння да спраў, думак і здзяйсненняў вялікага чалавека.

Н. КАЛІШЭВІЧ.

● СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС

«...Я — за ўдзячнасць»

СВЯТЛО Ў ЗАЛЕ патухла неяк нечакана. І ўсе, хто прыйшоў на творчую сустрэчу з артыстам Сяргеем Гурзо, арганізаваную Беларускім аддзелам прапаганды кінамастацтва, крыху разгубіліся. Але ў гэты ж момант той, каго чакалі, ужо дзейнічаў. Ён спяваў у вагоне, акампануючы сабе на гітары, а потым, калі высветлілася, што ў яго няма білета, выскачыў на хаду з электрычкі, смеючыся над разгубленымі кантралёрамі. Толькі быў ён у гэтым выпадку не Сяргей Гурзо, а Юрка Казакоў.

Такім кіпучым і не заўсёды ўраўнаважаным, як у фільме «Ніхто другі», для многіх і запомніўся Гурзо-артыст па шматлікіх кінастужках з яго ўдзелам.

І вось — асабістая сустрэча...

Малады, амаль што юнацкі твар, невысокая, рухавая постаць. Звычайны голас, гітара, з якой ён быў і зараз.

Артыст... Сяргею Гурзо трыццаць чатыры гады. Яго бацькі таксама працуюць на кінастудыі. Можа гэта і сфарміравала кола захапленняў іх сына. І ўжо шаснаццаць гадоў, як Сяргей, закончыўшы Маскоўскі інстытут кінематаграфіі імя Б. А. Бабачкіна, працуе ў кіно. За гэты час яму давялося здымацца ў дзесятках фільмаў, а ў многіх («Клятва Гіпакрата», «Абеліск», «Канал» і іншых) выконваць галоўныя ролі.

— Мне часцей за ўсё даводзілася выконваць супярэчлівыя, нават адмоўныя ролі,— расказвае Сяргей Гурзо. — І я лічу, што да іх нельга адносіцца неяк адназначна. Нават у самых адмоўных герояў я імкнуўся знайсці ў характары тое, што дало б магчымасць зразумець, якія абставіны спрыялі, а можа прымусілі яго стаць такім.

У гэты вечар Сяргей Гурзо яшчэ многа і захапляюча расказваў аб складанасцях экранізацыі літаратурных твораў, аб праблеме «разважаючага» дэтэктыва, аб сваіх першых спробах у мультыплікацыі. Акцёр падзяліўся творчымі планамі на будучыню. Хутка на экранах паявіцца новы мастацкі фільм, пастаўлены па яго аповесці «Два мячы на гэтым вялікім-вялікім футбольным полі» — пра лёс пачынаючай артысткі кіно.

На развітанне, адказваючы на пытанне, якімі якасцямі неабходна валодаць артысту, каб дабіцца пэўных поспехаў, Сяргей крыху задумаўся:

— Што ён такое, гэты «поспех»... Можа, вялікія аркушы плакатаў, фотакарткі ў кіёсках, імя ва ўсіх на вуснах? Не! Я ўпэўнены, што поспех заключаецца ў тым, каб прайсці праз выпрабаванні славай і застацца самім сабой. Толькі тады можна разлічваць на павагу і ўдзячнасць гледачоў. Я — за ўдзячнасць.

В. ЧАРНЯЎСКІ,
студэнт журфака.

● З НАШАЙ ПОШТЫ

«Дала народная ўлада...»

У СЯБЕ НА РАДЗІМЕ кожны з нас па-рознаму ўяўляў далёкую Савецкую краіну. Адных здзіўляла яна бясконцасцю лясоў і стэпаў, іншых — магутнымі рэкамі і бяздоннымі азёрамі. Але найбольш — людзьмі, працавітымі і прыгожымі, смелымі і дужымі, на долю якіх выпалі шматлікія выпрабаванні. І не сакрэт, што кожны, хто прыехаў у СССР вучыцца, імкнецца як мага больш даведацца аб краіне. Так і я. За тры гады давялося ўбачыць малыя і вялікія гарады: быў у Маскве, Кіеве, Ленінградзе, Брэсце, Бабруйску... А вось у вёсцы пабываць не прыйшлося. Таму вельмі ўзрадаваўся, калі паявілася магчымасць наведаць вядомую ў Беларусі гаспадарку — калгас «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага, уласнымі вачамі ўбачыць, як жывуць і працуюць савецкія калгаснікі.

З Мінска выехалі раніцой. У аўтобусе — мае таварышы, замежныя студэнты, што займаюцца на факультэце журналістыкі. Усе з цікавасцю прыпалі да вокнаў. Абапал дарогі — палеткі, лясы, зноў палеткі. На ўзгорках, ля вёсак,— помнікі партызанам і байцам Чырвонай Арміі. Вось у такі час з найбольшай сілай адчуваеш, як многа гора зведала гэтая зямля, як праз сорак гадоў адгукаецца жорсткая рэчаіснасць вайны.

Праз некалькі гадзін былі ў калгасе. Сустрэў нас сакратар партыйнай арганізацыі гаспадаркі М. Д. Лянковіч. Вось што ён расказаў:

— Калгас наш створаны ў 1931 годзе. Быў ён невялікім і, як кажуць, ледзь дыхаў. Не паспелі стаць на ногі, як пачалася вайна. Якая тут праца... Усе пайшлі ваяваць. Пра вайну можна расказваць доўга, але я не аб гэтым. Не менш цяжка было і пасля яе, калі давялося ўзнімаць разбураны ворагам калгас. Ды людзі верылі, што прыйдзе лепшы час, таму працавалі самааддана, упарта. У пачатку 50-х адбылося ўзбуйненне калгаса: да нас далучылі адзінаццаць гаспадарак. Узначаліў «Рассвет» вядомы ўсёй краіне чалавек — Герой Савецкага Саюза К. П. Арлоўскі. Дарэчы, праз некаторы час на яго грудзях заззяла яшчэ адна Зорка Героя, узнагарода за мірную працу.

Сёння на 9 тыс. гектараў зямлі, у жывёлагадоўлі і ў сферы абслугоўвання працуе звыш 1200 чалавек. Сапраўды, лічба вялікая. Але работы хапае кожнаму. Ёсць яна і для маладых: у калгасе 108 трактароў, 105 аўтамашын, 44 збожжа- і бульбаўборачныя камбайны.

На ўласныя сродкі ў калгасе будуюцца сучасныя дамы для механізатараў і жывёлаводаў, спецыялістаў і паляводаў, пабудаваны рэстаран, гасцініца, пяць дзіцячых садоў, музычная школа, узводзіцца гарбарны завод...

Мікалай Дзмітравіч яшчэ доўга расказваў аб сваёй гаспадарцы, прыводзіў лічбы, якія красамоўна сведчылі аб перавагах сацыялістычнага ладу жыцця, аб неабмежаваных магчымасцях свабоднай працы, той працы, што дала савецкаму чалавеку народная ўлада. Я слухаў і думаў: кожны з нас быў бы шчаслівым, калі б у нашых краінах сяляне жылі так, як калгаснікі з беларускага калгаса «Рассвет» імя К. П. Арлоўскага. **М. ХУСЕЙН (Сірыя),**
студэнт III курса факультэта журналістыкі.

АД МАСАВАСЦІ — ДА МАЙСТЭРСТВА

Сёння ў 24 спартыўных секцыях (гімнастыкі, шахмат, самба, лёгкай атлетыкі, футбола і інш.) БДУ імя У. І. Леніна займаецца звыш 6 тысяч студэнтаў і супрацоўнікаў, для якіх спорт стаў неад'емнай часткай жыцця.

НА ЗДЫМКУ: ідзе трэніроўка універсітэцкай валейбольнай каманды.

Фота **В. Шачака.**

ВІНШУЕМ З ЧЭМПІЁНСКІМ ТЫТУЛАМ!

БОЛЬШ ЗА ГОД працягваліся фінальныя гульні чэмпіяната СССР па рускіх шашках.

Першынство па перапісцы аспрэчвалі 21 фіналіст — кандыдаты і майстры спорту СССР.

У канцы лістапада падведзены вынікі спаборніцтваў. Атрымаўшы пяць перамог пры 15 нічыіх і набраўшы 12,5 ачка з 20 магчымых, чэмпіёнам краіны ўпершыню стаў старшы выкладчык, намеснік дэкана фізічнага факультэта Георгій Іосіфавіч **Пятровіч.**

Віншуем Г. І. Пятровіча з заслужанай перамогай і жадаем новых спартыўных поспехаў.

7 СНЕЖНЯ ўрачыста адкрылася XXXI спартакіяда універсітэта, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР.

Матэрыялы аб адкрыцці і ходзе спартакіяды будуць змешчаны ў наступным нумары газеты.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

9 снежня 1982 г.

Зак. 2141. АТ 21624.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ